# Патэйка Эдуард Мацвеевіч



Эдуард Мацвеевіч ПАТЭЙКА родам з вёскі Ігнацова.

Прызваны на вайну ў 1944 годзе.
*“<…>. З Гудагая нас цягніком завезлі ў Маладзечна, далей ішлі пешшу. Усе мы трапілі ў адзін полк. Мае браты – у 1-шы батальён, я – у 2-гі. У пяхоту, царыцу палёў. Лагер разбілі ў лесе, зладзілі там на скорую руку зямлянкі – вось і ўсе казармы. На працягу 2-х тыдняў нас павучылі страляць, акопвацца, паганялі бягом па лесе – і гатоў, шагам марш на вайну! <…>”. (З успамінаў ветэрана, “Астравецкая праўда”, №40-41, 2004г.)*

Быў стралком 2-га батальёна 30-га пяхотнага палка 9-й пяхотнай дывізіі.

Узнагароджаны медалямі “За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941-1945гг.”, “За Одар, Нісу і Балтыку”, ордэнам Айчыннай вайны II ступені.

Удзельнік Вісла-Одарскай аперацыі. Атрымаў асколкавае раненне ў плячо. Дайшоў да Берліна.

Тэрміновую даслужваў у польскім горадзе Згожэлец.

Вярнуўся дамоў у снежні 1946-га.

Пасля вайны працаваў у калгасе імя Куйбышава брыгадзірам, сталяром.

https://www.ostrovets.by/news/novosti/news57906.html